Спішыце першы абзац тэксту, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары. Першы сказ разбярыце па членах сказа.

**Назоўнікі маюць розныя лексічныя значэнні. Гэта назвы канкрэтных прадметаў *(кніга, дом)*, раслін *(кветка, трава)*, асоб *(сусед, пісьменнік)*, жывых істот *(воўк, шчупак)*, з'яў прыроды *(маланка, дождж)*, дзеянняў *(плаванне, бег)*, апрадмечаных уласцівасцей *(смеласць, радасць)*, розных падзей *(свята, сход)*, абстрактных паняццяў *(думка, вечнасць)*, прымет *(блакіт, сінь)*.**

**156.** Прачытайце тэкст. Падбярыце да яго загаловак.

Калі ёсць што самае прыгожае ў свеце, то гэта воблакі. О, як яны збіраюцца! Як плывуць і растаюць у сіняве!

Толькі воблакі могуць расказаць пра нястрымны рух жыцця. Іх трэба навучыцца чытаць і разумець. Воблакі бываюць высокія і нізкія. На два паверхі і нават на тры. Ёсць рэдкія і суцэльныя. Ёсць хмары і хмаркі. Ёсць пахмаркі. Адны прыносяць яснасць, другія — непагадзь і навальніцу.

Воблакі ўпрыгожваюць неба, апранаюць яго *(Паводле І. Грамовіча)*.

Знайдзіце ў тэксце назоўнікі. Выпішыце іх, размеркаваўшы па наступных групах: 1) назвы прымет; 2) назвы абстрактных паняццяў; 3) назвы з'яў прыроды; 4) назвы дзеянняў.

● Выпішыце з тэксту роднасныя словы, абазначце корань.

## § 24. Агульныя і ўласныя назоўнікі. Правапіс уласных назваў

**157.** Прачытайце тэкст. Як вы думаеце, якіх назоўнікаў у беларускай мове больш: агульных ці ўласных?

Назоўнікі падзяляюцца на агульныя і ўласныя. Агульныя адрозніваюцца ад уласных тым, што яны называюць аднародныя прадметы (брат, чалавек, радасць, чырвань), а ўласныя з'яўляюцца назвамі адзінкавых прадметаў (Мінск, Няміга, (плошча) Перамогі, Алеся).



Правообладатель Национальный институт образования

Краіна — гэта агульная назва для ўсіх краін, аднак у кожнай краіны ёсць індывідуальнае імя: Беларусь, Расія, Балгарыя і інш. Ёсць свае імёны, імёны па бацьку і прозвішчы ў кожнага чалавека. Васілевіч Алена Сямёнаўна — прозвішча, імя і імя па бацьку беларускай пісьменніцы. Уласныя загалоўкі маюць і кнігі. «Пачакай, затрымайся...» — кніга Алены Васілевіч.

Выпішыце з тэксту па пяць агульных і ўласных назоўнікаў, дапоўніце рады сваімі прыкладамі.

Якія творы Алены Васілевіч вы чыталі?

**Агульныя** назоўнікі — гэта назвы аднародных прадметаў, з'яў, паняццяў: *горад, колер, свята, зязюля.*

**Уласныя** назоўнікі — гэта імёны і прозвішчы, геаграфічныя і астранамічныя назвы, клічкі жывёл, назвы свят, гістарычных падзей, помнікаў, арганізацый *(Іван Дамінікавіч Луцэвіч, Гомель, Марс, Жучка, Дзень Перамогі, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь).*

У якасці ўласных назваў могуць выступаць словазлучэнні. У сказе яны з'яўляюцца адным членам сказа.

**158.** Прачытайце верш. Спішыце. Падкрэсліце агульныя назоўнікі. Назавіце іх пачатковую форму.

Калі рана ўстанеш —
Разам з сонц..м зыркім,
Што ўсплыве над зыбкім
В..гнішчам зары, —
Колькі ты пабачыш
З'яў жыцця дз..восных,
Колькі цудаў розных
Згледзіш на двары!

Калі рана ўстанеш —
Разам з мамай, татам
Ды за справу-працу
**Возьмешся** хутчэй, —
Колькі ты пазнаеш
Радасці н..сцерпнай —
Аж да песні з сэрца,
Аж да слёз з вачэй!

*Н. Гілевіч.*

Да слова *вогнішча* падбярыце і запішыце роднасныя словы, выдзеліце ў іх корань. Ад чаго залежыць правапіс першай літары ў корані гэтых слоў?



Правообладатель Национальный институт образования

**159.** Прачытайце. Знайдзіце ў сказах уласныя назоўнікі, якія маюць адпаведныя агульныя. З якой літары пішуцца агульныя назоўнікі?

1. Англійскі граф Сэндвіч прасіў падаваць на снеданне складзеныя разам дзве лустачкі хлеба, паміж якімі клалі халоднае мяса. 2. Французскі повар Аліўе прыдумаў знакаміты салат у другой палове XIX стагоддзя. 3. Марожанае з рознымі дабаўкамі — шакаладам, арэхамі і ягадамі — упершыню было прыгатавана ў французскім горадзе Пламбір.

Запішыце парамі ўласныя назоўнікі і адпаведныя агульныя.

Уласныя назоўнікі пішуцца з вялікай літары: *Палессе, вуліца Вінаградная, кошка Мурка.*

Назвы кніг, газет, часопісаў, карцін, кінафільмаў, фабрык і іншыя пішуцца з вялікай літары і бяруцца ў двукоссе: *аповесць «Насцечка», карціна «Хлеб», фабрыка «Камунарка», стадыён «Дынама».*

Калі ў назве ёсць слова ***імя***, то яна ў двукоссе не бярэцца: *бібліятэка імя Міхася Лынькова, парк імя Янкі Купалы.*

**160.** Прачытайце тэкст. Каго са знакамітых людзей Віцебшчыны вы ведаеце?

### Выдатныя мясціны Віцебшчыны

Віцебшчына — легендарны край блакітных азёр, старажытных гарадоў і старадаўніх помнікаў. Ён даў свету такія імёны, як Ефрасіння Полацкая, Францыск Скарына, Марк Шагал, Жарэс Алфёраў, Іван Чэрскі, Леў Выгоцкі...

Менавіта на віцебскай зямлі жыў сусветна вядомы мастак-авангардыст Казімір Малевіч. Тут таленавіты жывапісец Ілья Рэпін стварыў амаль 40 карцін і малюнкаў. Унікальныя прыродныя жамчужыны Віцебшчыны — Нацыянальны парк «Браслаўскія азёры», які славіцца сотнямі маляўнічых азёр і астравоў, Ландшафтны заказнік «Ельня», дзе знаходзіцца адзін з самых вялікіх у Еўропе масіваў





Правообладатель Национальный институт образования

старадаўніх вярховых балот і ледавіковых азёр *(Паводле электроннага рэсурсу Belarus.by)*.

Выпішыце з тэксту ўласныя назвы. Што яны абазначаюць? Падкрэсліце вялікую літару ў назоўніках. Растлумачце яе правапіс.

● Спішыце першы сказ, разбярыце яго па членах сказа, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку. Якімі членамі сказа з'яўляюцца назоўнікі?

Выкарыстоўваючы матэрыялы электронных рэсурсаў, складзіце для аднакласнікаў паведамленне пра Нацыянальны парк «Браслаўскія азёры» або Ландшафтны заказнік «Ельня» на тэму «Запрашаю вас у падарожжа па...».

**161.** Спішыце верш, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары. Падкрэсліце ўласныя назоўнікі, растлумачце правапіс вялікай літары.



**На ўроку геаграфіі**

— Пакажы мне *(Е/е)*нісей.  
Як той слуп, стаіць *(М/м)*ацвей.  
— Ну, а *(В/в)*олга, *(В/в)*олга дзе?  
— Ды няма яе н..дзе.  
— *(С/с)*віслач пакажы яшчэ.  
— *(С/с)*віслач? Вунь яна ц..чэ.  
Праз *(ва/а)*кно яна відаць,  
Мне н..цяжка паказаць.

*А. Дзяружынскі.*

## § 25. Назоўнікі адушаўлёныя і неадушаўлёныя

**162.** Прачытайце тэкст. Да якога стылю і тыпу маўлення ён адносіцца? Абгрунтуйце стылістычную ролю назоўнікаў у тэксце.

**Крыўда**

Вярнуўся Косця са школы надзьмуты і сярдзіты.

— Ты што сёння такі? — спытала мама.

— Мне настаўніца паставіла дрэнную адзнаку, — адказаў хлопчык. — За ката.

Косцік разгарнуў сшытак і паказаў намаляванага ката. Кот быў прыгожы: хвост трубою, поўсць паласатая і вусы, як у тыгра.



Правообладатель Национальный институт образования